***К. І. Ракіцкая,***
***намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце***
***беларускамоўнай гімназіі №2 г. Барысава***

## Беларусь спартыўная
## Сцэнарый спартландыі паміж настаўнікамі і вучнямі

**Вядучы.** Добры дзень, дарагія сябры, шаноўныя ўдзельнікі спаборніцтваў! Сардэчна запрашаем вас, дарагія балельшчыкі і госці!

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой
Твой родны край, твая Айчына,
Жыццё тваё і гонар твой.

І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла – Беларусь.

*Ю. Свірка.*

Мы, беларусы, ганарымся сваімі славутымі продкамі, выдатнымі дзеячамі, якія марылі аб незалежнай Беларусі. 70 гадоў назад нашы дзяды абаранілі нас ад захопнікаў. І сёння мы жывём у незалежнай краіне, якая ўваходзіць у дваццатку мацнейшых дзяржаў свету, што прымаюць удзел у Алімпійскіх гульнях.

Спорт і здаровы лад жыцця сталі візітнай карткай Беларусі. Таму сёння сустрэнецца будучае і цяперашнее спартыўнае жыццё Барысаўшчыны. Хай гэта сустрэча будзе па-сапраўднаму таварыскай.

Раўненне на дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Спартыўнае свята лічыць адкрытым *(Гучыць гімн РБ).*

А зараз мы пазнаёмімся з галоўнымі дзеючымі асобамі нашага спартыўнага спаборніцтва (прадстаўленне журы). Вітаем нашы каманды: «Надзея» – каманда вучняў 9-11 класаў, «Алімпійцы» – каманда настаўнікаў.

Давайце пачнём наша свята. А дапамагаць нам сёння будзе спартыўны гонар нашай краіны: усім вядомыя спартсмены і спартсменкі, пераможцы алімпійскіх і міжнародных гульняў.

75 беларусаў у розны час станавіліся алімпійскімі чэмпіёнамі. Але ў чарадзе гэтых шматлікіх перамог ёсць тыя, хто застанецца ў памяці яшчэ на доўгія гады. Да іх, безумоўна, адносіцца сенсацыйная перамога Юліі Несцярэнкі ў бегу на 100 метраў на Афінскай алімпіядзе 2004 года. Абагнаўшы на дыстанцыі ўсіх вядучых бягунак свету, беларуска адразу ж атрымала мянушку Белая Маланка.

І першую эстафету мы пачнем з лёгкай атлетыкі. Вам неабходна перадаць эстафетную палачку (праводіцца эстафета).

**Вядучы.** Для таго каб даведацца, якая будзе наступная эстафета, вам неабходна адгадаць загадку.

Зялёныя і густыя
На градцы выраслі кусты.

Падкапаў іх наш Андрэйка,
Пад ім – цэлая сямейка. (Бульба.)

Эстафета «Уборка ўраджаю»

**Вядучы.** Бліскучым трыўмфам беларускіх бегуноў стаў чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы у 2015 г. у Пекіне. Ён запомніўся золатам Марыны Арзамасавай у бегу на 800 м і бронзай Аліны Талай на 100-мятроўцы з бар'ерамі.

Эстафета «Бег з перашкодамі»

**Вядучы.** Беларуская школа мятальнікаў ядра, дыска, молата вядома ва ўсім свеце. Яскравае таму падцвержанне – буйныя перамогі беларускіх спартсменаў на алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету. Імёны Эліны Зверавай, Яніны Карольчык, Івана Ціхана, Вадзіма Дзевятоўскага, Аксаны Мяньковай, Наталлі і Андрэя Міхневічаў, Надзеі Астапчук вядомы ўсім. Зараз мы прапануем вам паўтарыць алімпійскія рэкорды.

Эстафета «Кіданне набіўнога мяча»

**Вядучы.** Немалы ўклад у пазнавальнасць нашай краіны ўнеслі тэнісісты. На гульнях 2012 года ў Лондане экс-першая ракетка свету Вікторыя Азаранка заваявала бронзавы медаль у адзіночным разрадзе, а затым у пары з Максімам Мірным выйграла яшчэ і золата!

Вы зможаце на сабе адчуць, праз што прыйшлося прайсці нашым чэмпіёнам.

Эстафета «Тэнісная ракетка і паветраныя шары»
*(Музычны нумар)*

**Вядучы.** А зараз тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску» запрашае вас праверыць свае веды па роднай мове, культуре, гісторыі. Вам неабходна адказаць на цікавыя пытанні на веданне беларускай мовы, літаратуры, этнаграфіі, мастацтва і спорту. Пры гэтым праявіць не толькі свае веды, але і вытрымку, хуткую рэакцыю, рашучасць, уменне дзейнічаць камандай і будаваць стратэгіі.

Пытанні:

1. З якімі краінамі мяжуе Беларусь? (*Літва, Латвія, Польшча, Украіна, Расія.*)
2. Якое возера ў нас называюць «беларускім морам»? (*Возера Нарач.*)
3. Назавіце самую вялікую раку Беларусі. (*Днепр.*)
4. Якія колеры на беларускім сцягу? (*Чырвоны, зялёны, белы.*)
5. Сёння ў краіне працуе больш за 25 тысяч розных фізкультурна-спартыўных аб'ектаў, і колькасць іх рэгулярна папаўняецца новымі будынкамі, якія адпавядаюць самым сучасным сусветным стандартам. Назавіце самыя вядомыя з іх. *(Алімпійскі*

*спартыўны комплекс «Стайкі», Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі ў Ратамцы, Гарналыжны комплекс-курорт «Лагойск», Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр «Сілічы», Шматфункцыянальны спартыўна-відовішчны комплекс «Мінск-Арэна», Шматфункцыянальны культурна-спартыўны і забаўляльны комплекс «Чыжоўка-Арэна», Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы».)*

*6.* Назавіце год (горад), у якім беларусы ўпершыню прынялі ўдзел у Алімпійскіх гульнях. *(Упершыню беларусы прынялі ўдзел у Алімпійскіх гульнях у 1952 годзе ў Хельсінкі ў складзе зборнай СССР.)*

*7.* Упершыню наша каманда прадставіла Беларусь як суверэнную дзяржаву ў 1994 годзе на Алімпійскіх гульнях у Ліліехамеры. Дэлегацыя была сціплай: усяго 33 спартсмены. Але і яны без медалёў не паехалі – заваявалі два срэбры. Ужо на наступныя гульні ў Атланту адправіліся 133 прадстаўнікі нашай краіны, якія заваявалі 15 узнагарод. У якім годзе і дзе быў дасягнуты самы гучны поспех ? *(Летнія гульні ў 2008 годзе ў Пекіне. У медальнай скарбонцы каманды аказалася 19 узнагарод: 4 залатыя, 5 срэбных і 10 бронзавых. На паралімпійскіх гульнях у Пекіне ў 2008 годзе Беларусь заваявала 13 медалёў, у тым ліку 5 залатых.)*

*8.* На апошняй алімпіядзе ў Сочы нашы спартсмены ўстанавілі рэкорд па колькасці залатых медалёў, заваяваных на зімовых гульнях. Назавіце колькасць медалёў і агульнакаманднае месца ў медальным заліку. *(Пяць залатых і адна бронзавая ўзнагарода дазволілі заняць самае высокае ў гісторыі, восьмае, месца ў агульнакамандным медальным заліку.)*

*9.* Назавіце імя лепшай спартсменкі Еўропы 2014 года, на думку спартыўных журналістаў Старога Свету – членаў Міжнароднай асацыяцыі спартыўнай прэсы ад Еўропы. *(Домрачава стала першай беларускай спартсменкай, якая перамагла ў галасаванні, што праводзілася ўжо 32-і раз з 1983 года. У мужчын лепшым у 1992 годзе быў прызнаны беларускі гімнаст Васіль Шчэрба.)*

10. Беларусь можа ганарыцца сваёй гісторыяй удзелу ў Алімпійскіх гульнях. Назавіце агульную колькасць беларусаў, сталі алімпійскімі чэмпіёнамі. *(75, а ўсяго 280 ураджэнцаў Беларусі сталі чэмпіёнамі свету і Еўропы ў многіх відах спорту.)*

**Вядучы.** Лондан запомніўся аматарам спорту першымі алімпійскімі ўзнагародамі ў плаванні. 2 серабра беларускай «залатой рыбкі» Аляксандры Герасімені.

<u>Эстафета «Бег з абручамі «пераправа»</u>

**Вядучы.** 15 лістапада ў паядынку апошняга тура чэмпіяната Беларусі па футболе першай лігі маладая сталічная дружына «Крумкачы» перамагла магілёўскі «Дняпро» і атрымала пропуск у элітны дывізіён. У нашага дванаццацікратнага чэмпіёна, футбольнага клуба БАТЭ, з’явіўся новы малады канкурэнт. Але спадзяюся, што з нашай дапамогай БАТЭ яшчэ доўга будзе займаць месца чэмпіёна.

<u>Эстафета «Бег з мячом»</u>

**Вядучы.** Наступную эстафету мы правядзем разам з выдатнай беларускай біятланісткай, трохразовай алімпійскай чэмпіёнкай 2014 года і двухразовай чэмпіёнкай свету (2012 г. і 2013 г.), заслужаным майстрам спорту Рэспублікі Беларусь, уладальніцай некалькіх малых Крыштальных глобусаў, пераможцай Кубка свету па біятлоне ў сезоне 2014/15, самай тытулаванай спартсменкай Беларусі ў гісторыі зімовых Алімпійскіх гульняў, Героем Беларусі – Дар'яй Домрачавай.

<u>Эстафета «Бег з лыжнымі палкамі і кіданне ў цэль»</u>

**Вядучы.** Шэсць медалёў з пяці алімпіяд, з якіх палова – залатыя. Сёння фрыстайл у Беларусі адзін з найбольш абмяркоўваемых відаў спорту. Але, віншуючы чэмпіёнаў, мала хто ўспамінае, што ў наступным годзе наша лыжная акрабатыка адзначыць толькі 30-летні юбілей. Аляксей Грышын і Дзмітрый Дашчынскі, Ала Цупер і Антон Кушнір. Іх імёны ведаюць усе беларусы.

Фрыстайл у перакладзе – «вольны стыль». А для вас – <u>камбінаваная эстафета.</u>

*(Музычны нумар «Папуры беларускіх танцаў»)*

**Вядучы.** Вось і падыйшоў час падвесці вынікі. Слова прадстаўляецца журы.

(*Журы падводзіць вынікі, узнагароджвае каманды.*)

**Вядучы.** З кожным годам у нашай краіне колькасць людзей, якія займаюцца спортам на аматарскім узроўні, расце. Цяпер іх колькасць дасягае 1 520 000 чалавек. І дзякуючы сённяшняму святу гэта колькасць значна павялічылася! Да новых сустрэч!